Эмілія Легутэ



...Дзякуй табе за шчасьце.

Калі ты побач, памерці мне ня цяжка...

# Палёт каханьня

*Пераклад з літоўскай Валяньціна СТЭХА.*

«Севільскі цырульнік». Салістка Марыя Калас... Па сьпіне асьпіранткі Менскай акадэміі мастацтваў Вольгі Дзёмкінай паўзуць мурашкі, з кожным гукам яны пранікаюць усё глыбей і глыбей, пакуль зусім не авалодваюць ёю. Цяпер Вольга ўжо не маладая дзяўчынка, апранутая ў паркалёвы сарафанік, абутая ў падкаваныя цяжкія чаравікі. Яна – вялікая белая птушка, якую, то нясе нейкаю таямнічаю сілай уверх, то апускае ўніз. У залежнасьці ад голасу сьпявачкі. Такога душэўнага ўзрушэньня яна яшчэ ня зьведвала. Хіба толькі той надрыўны боль, калі пасьля Чарнобыльскай аварыі памерлі яе сястра з мужам – цела ад іх, яшчэ жывых, адвальвалася нібыта разваранае... Апошнімі словамі сястры былі: Вольга, пакідаю на цябе сваіх дзяцей...

Вольга адчула, што толькі цяпер яна пазбавілася тых жудасных успамінаў. Яна – вялікая белая птушка... У яе з-пад ног паплыла зямля, Парыж, куды разам з





*Партрэты закаханых на зрэзах дрэваў...*

іншымі маладымі творцамі яна была запрошана на мастацкую выставу і экспанавала свае габелены.

Вольга заплюшчыла вочы і свабодна лунала ў гэтай бяскрайняй прасторы. Гэтая сіла духоўнай свабоды панесла, узьняла яе бы на крылах так далёка і высока, што яна нічога вакол ня чула – адно гудзеньне касьмічнай прасторы.

У рэальны сьвет вярнулася толькі тады, калі ў зале ўсталявалася дзіўная цішыня. Яна адкрыла вочы і ўбачыла дырыжора, які стаяў перад ёй. Ён пакланіўся і вывеў яе на сцэну, пацалаваў руку і пакланіўся публіцы.

Публіка пляскала ў далоні стоячы. І толькі цяпер Вольга ўважліва паглядзела на дырыжора: высокі, стройны, натхнёны, засяроджаны твар, са зьлёгку пасівелымі скронямі...

У гардэробе ён узяў яе паліто, дапамог апрануцца і адрэкамендаваўся:

— Жорж Пассот.

— Вольга, – ціха, занадта ціха вымавіла яна.

Наступнага дня яны сустрэліся на выставе. Габелен Вольгі Дзёмкінай «Шэрань» сьвяціўся бела-фіялетавымі сьвечкамі ярчэй звычайнага. Жорж доўга стаяў ля яго, нешта казаў, але яна не разумела – па-французску ня ведала ні слова, тады яны пачалі размаўляць па-нямецку.

І пачалі ляцець з Парыжу ў Менск лісты, тэлефонныя званкі, тэлеграмы. За імі, як і за ўсімі за савецкім часам, сачылі, лісты часта прападалі. Жоржу спатрэбіліся тытанічныя намаганьні, каб вызваць Вольгу ў Парыж і ўжо ня выпусьціць яе. Яны пабраліся шлюбам.

«Мядовы месяц», дакладней дні сьветлага бязвоблачнага шчасьця, лецьма праляцелі ў гарах Швейцарыі, у катаньні на лыжах. Вольга сама сабе зьдзіўлялася: дзе і калі яна навучылася так добра катацца? Спускалася ўсьлед за Жоржам з кожнай гары... І тады зразумела: яе, сьціплую вясковую дзяўчынку можа ўзвысіць, надаць ёй сьмеласьці, упэўненасьці ў сабе – толькі каханьне. Яна адчула сілу прыроды, што натхняе на творчасьць. Які шырокі, неабмежаваны сьвет творцы, што залежыць толькі ад яе самой. Толькі яна можа даць гэтай цьвёрдай скале, каменю, дрэву новае жыцьцё, зусім іншае аблічча. І лётала Вольга з аднаго горнага хрыбта на другі, нібыта птушка, пралятаючы над перашкодамі. На душы было лёгка, добра, сьветла.

А па вяртаньні Жорж пачаў недамагаць. Дактары дыягназавалі апошнюю стадыю раку крыві – саркому.

Ён адмовіўся ад якіх бы там ні было лекаў, хіміятэрапіі.

— Лёс наканаваў мне спазнаць імгненьні шчасьця, хай ён кіруе маім жыцьцём і далей, – казаў ён.

Вольга кідалася нібыта лебедзь з падрэзанымі крыламі. Не адыходзіла ад ложку мужа нават калі ён спаў: скурчвалася побач прысунуўшы крэсла, і трымала ў далоні яго высахлую, як шчэпка, руку, ужо ня здольную падняць дырыжорскай палачкі.

Жорж слабеў не па днях, а па гадзінах. Вольга сунімала боль мужа марфінам, а ён ляжаў заплюшчыўшы вочы, спакойны – яшчэ чалавек, ці ўжо толькі ягоны дух?

Аднойчы Вольга адчула, што рука Жоржа тузанулася. Глянула на яго – вочы адкрытыя, прытомны. Вусны заварушыліся:

– Дзякуй табе за шчасьце. Калі ты побач, памерці мне ня цяжка.

Гэта былі яго апошнія словы.

Вольга закрыла мужу вочы і яшчэ доўга трымала яго астываючую руку ў сваёй, пакуль тэлефонны званок ня змусіў выпусьціць яе.

– Мама памірае, прыязджай, – паведаміла сястра.

Вольга, не сказаўшы ні слова, паклала слухаўку, склала накрыж на грудзях Жоржа рукі і сядзела пры ім, запаліўшы сьвечку, ажно да самай раніцы.

Пасьля ў яе зьявілася звычка прыходзіць у парк, які знаходзіўся непадалёк ад старога замку. Ляжа на лужку, пакладзе рукі пад галаву і глядзіць угару, дзе перашэптваюцца сплёўшыміся галінамі старыя, стогадовыя дрэвы. І аднойчы ў яе ўзьнікла думка намаляваць два вельмі старыя дрэвы, што прыхінуліся адно да другога.

Ранкам, узяўшы з сабой паперу для эскізаў, Вольга пасьпяшалася на тое ж самае месца і аж ускрыкнула з перапуду: дрэвы былі сьпілаваныя. Сьпешна знайшоўшы маладога чалавека, які прыглядаў за паркам, яна спытала:

– Хто сьпілаваў дрэвы?

– Я, мне загадалі. Сказалі, старыя, гнілыя, могуць паваліцца і пашкодзіць сьцяну.

У яе раптам зьявілася неадольнае жаданьне даць гэтым дрэвам новае жыцьцё. Яна папрасіла хлопца адпілаваць ад камлёў гэтых дрэваў па дыску, прынесла іх дамоў і пачала маляваць: на адным намалявала драматычны твар мужчыны, на другім – сьціплую, летуценна ўсьміхаючуюся, маладую жанчыну.

На Міжнароднай выставе мастацтва і літаратуры LUTEC, наладжанай у 2003 годзе ў Парыжы, Вольга Дзёмкіна-Пассот была ўзнагароджаная залатым медалём...